19. НГАБ. – Фонд 21. – Воп. 1. – Спр. 6. – Л. 100, 142, 144, 177, 211, 255, 289, 392, 513.
20. НГАБ. – Фонд 21. – Воп. 1. – Спр. 37. – Л. 6–8.
21. НГАБ. – Фонд 21. – Воп. 1. – Спр. 74. – Л. 26–31.
22. Памятная кніжка Мінскай губерні за 1878 год. – Мінск: Тыпаграфія губернскага праўлення, 1878. – Ч. 1. – 681 с.
23. НГАБ. – Фонд 10. – Воп. 1. – Спр. 108. – Л. 7.
24. НГАБ. – Фонд 10. – Воп. 1. – Спр. 384. – Л. 1.
25. НГАБ. – Фонд 21. – Воп. 1. – Спр. 118. – Л. 556.

**(Дата падачы: 28.02.2019 г.)**

*А. С. Ляневіч*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск
*A. Lianevich*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 94(4):796**

# СТАНАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ СІСТЭМЫ РЭГУЛЯВАННЯ СФЕРЫ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ І СПОРТУ Ў ДРУГОЙ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

# FORMATION OF THE STATE SYSTEM OF REGULATION OF THE SPHERE OF PHYSICAL CULTURE AND SPORTS IN THE SECOND REPUBLIC OF POLAND

*У артыкуле разгледжана гісторыя станаўлення дзяржаўнай сістэмы рэгулявання спартыўнай сферай ў Другой Рэчы Паспалітай. Вылучаны асноўныя моманты фарміравання дзяржаўных інстытутаў у галіне фізічнай культуры і іх нарматыўнай базы міжваеннай Польшчы, цэнтральнага апарата і рэгіянальных структур.*
*Ключавыя словы: фізічная культура і спорт; Другая Рэч Паспалітая; Міністэрства; Дзяржаўнае рэгуляванне; Ваенная падрыхтоўка; Алімпійскія гульні.*

*The article describes the history of the formation of the state system of regulation of the sports sphere in the Second Republic of Poland. Highlighted the main points of the formation of state institutions in the field of physical culture and their regulatory framework of interwar Poland, central administration and regional structures.*
*Key words: physical culture and sport; Second Republic of Poland; Ministry; State regulation; Military training; Olympic sports.*

У першай палове XX стагоддзя спорт пачынае займаць адно з асноўных месцаў у культурным і сацыяльным жыцці грамадства Другой Рэчы Паспалітай. Акрамя непасрэдна фізічнага выхавання ў навучальных установах, структурах падпарадкаваных Міністэрству вайсковых спраў (Ministerstwo Spraw Wojskowych), стварэнне спартыўных клубаў і спартыўна-патрыятычных аб'яднанняў спрыяла прыцягненню шырокіх мас грамадства ў спартыўную сферу і развіццю разнастайных яго відаў.

Неабходна дадаць, што ў перашай палове XX стагоддзя фізічнаму вы-

хаванню надавалася вялікая ўвага. Дадзеная традыцыя працягвалася яшчэ з XIX стагоддзя, калі адпаведныя заняткі практыкаваліся ў якасці сродку ўмацавання здароўя ў выхаваўчым і адукацыйным працэсе ў выглядзе гімнастычных заняткаў.

Гэтая з'ява была характэрна фактычна для ўсіх еўрапейскіх краін. Напрыклад у Германіі Фрыдрых Людвіг Ян (Friedrich Ludwig Jahn, 1778–1852), якога называюць бацькам нямецкай гімнастыкі, распрацаваў шэраг гімнастычных практыкаванняў, тэорыю гімнастыкі, якая пазней актыўна выкарыстоўвалася ва ўсёй дзяржаве [2].

Шведская гімнастычная сістэма стваралася па ініцыятыве ўрада П'ерам Хенрыкам Лінгам (Pehr Henrik Ling, 1776–1839), пазней – яго сынам Ялмарам Лінгам (Hjalmar Ling, 1820-1886) і набыла папулярнасць ва ўсёй Еўропе [1].

Спорт, у сваю чаргу, успрымаўся як развага, альбо частка працэсу фізічнага выхавання, што было характэрна для канца XIX – пачатку XX ст.

Да палітычных падзей 1918 года, звязаных з абвяшчэннем Урада часовага Кіраўніка Дзяржавы і пазней – незалежнасці Польскай Рэспублікі, польская тэрыторыя знаходзілася ў складзе Расійскай, Аўстра-Венгерскай і Германскай імперый. Развіццё фізічнай культуры і спорту на дадзеных тэрыторыях адбывалася згодна з законамі і нарматыўнымі актамі адпаведных дзяржаў.

Трэба зазначыць, што гісторыя станаўлення і развіцця многіх спартыўных таварыстваў і аб'яднанняў адносіцца менавіта з вышэйзгаданым перыядам канца XIX стагоддзя. Найбольш буйное з іх – Гімнастычнае таварыства «Сокал» (Towarzystwo Gimnastyczne «Sokół»), было заснавана яшчэ ў 1867 годзе ў Львове, а таксама на польскіх землях Расійскай імперыі, а ў 1878 годзе ўзнікла Варшаўскае вёсельнае таварыства (Warszawskie Towarzystwo Wioślarskie) і г. д. [16].

Пасля здабыцця Польшчай самастойнасці функцыю дзяржаўнага рэгулявання спартыўнай сферай выконваў Рэферат фізічнага выхавання (Referat Wychowania Fizycznego) пры Міністэрстве па справах рэлігіі і народнай адукацыі (Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego), пазней – Аддзел школьнай гігіены і фізічнага выхавання (Wydział Higieny Szkolnej i Wychowania Fizycznego) [5].

Дадаткова пытаннямі фізічнай культуры займаўся Савет па пытаннях фізічнага выхавання і культуры цела (Rada Wychowania Fizycznego i Kultury Cielesnej), які быў утвораны Распараджэннем Міністра аховы здароўя ад 29 снежня 1919 года і фактычна з'яўляўся дарадчым органам пры адпаведным Міністэрстве [9].

У склад савету Рэферата фізічнага выхавання ўваходзілі прадстаўнікі (далей – Рэферат) чатырох міністэрстваў (Ministerstwa Zdrowia Publicznego,

Ministerstwa Spraw Wojskowych, Ministerstwa Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego, Ministerstwa Robót Publicznych), варшаўскага, кракаўскага, львоўскага і познаньскага універсітэтаў, секцыі фізічнага выхавання Таварыства польскіх настаўнікаў (Stowarzyszenie Nauczycielstwa Polskiego), шэрагу спартыўных аб'яднанняў, у тым ліку Польскага саюзу сокалаў (Związek Sokolstwa w Polsce) і інш. [15].

Галоўнай мэтай дадзеных структур было выпрацоўка нарматыўнай базы для навучальных устаноў і дадаткаў да школьных праграм па пытаннях фізічнага выхавання.

Актыўная папулярызацыя спорту ў 20-я гады мінулага стагоддзя ў Польскай Рэспубліцы, зацікаўленасць у фізічным выхаванні насельніцтва змусіла ўлады да стварэння асобнага кіруючага органа.

Згодна з пастановай Савета Міністраў ад 25 красавіка 1925 года быў створаны Вышэйшы савет па фізічнай культуры і ваеннай падрыхтоўцы (Naczelna Rada Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego), які курыраваў пытанні звязаныя з фізічным развіццём да 1927 года [7].

У склад новастворанай структуры ўваходзілі Міністр па справах рэлігіі і народнай адукацыі, па два дэлегаты вышэйадзначанага міністэрства, Міністэрства вайсковых спраў, Міністэрства ўнутраных спраў (Дырэкцыя службы здароўя), Міністэрства працы і сацыяльнай апекі.

Сярод галоўных задач Вышэйшага савета па фізічнай культуры і ваеннай падрыхтоўцы (далей – Вышэйшы савет), якія адзначаны ў Пастанове былі наступныя:

1) разгляд пытанняў у справах фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі;

2) прадастаўленне прапаноў адпаведным міністэрствам у справах фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі;

3) распрацоўка тэарэтычных прац у серы фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі;

4) пашырэнне ідэй фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі да абароны Дзяржавы;

5) рэгуляванне дзейнасці асобных дзяржаўных самаўрадавых устаноў у сферы фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі;

6) рэалізацыя самастойных ініцыятыў у сферы фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі;

7) накіроўваць дырэктывы Ваяводзкім Камітэтам фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі, а таксама ажыццяўленне кантролю над дзейнасцю Камітэтаў;

8) адкрытая справаздачнасць па дзейнасці ў сферы фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі [7].

Як бачна з прыведзеных пунктаў, Вышэйшы савет вялікую ўвагу павінен быў надаваць менавіта фізічнаму выхаванню і яго развіццю сярод

насельніцтва краіны. Акрамя гэтага, ён займаўся пытаннямі, звязанымі з ваеннай падрыхтоўкай, што магло быць абумоўлена наданнем вялікага значэння фізічнай адукацыі і яе ролі ў вайсковай справе з боку дзяржавы.

Пасля першага пленарнага паседжання, якое адбылося 28 сакавіка 1926 года ў Варшаве, былі агучаны мэты дзейнасці структуры. У прыватнасці адзначалася, што асноўным накірункам новай арганізацыі ёсць непасрэдны і якасны ўдзел у належнай працы па арганізацыі фізічнага выхавання і разам з ім ваеннай падрыхтоўкі, асабліва сярод моладзі, а таксама далучэнне дарослага насельніцтва да фізічнай культуры, заняткаў спартыўнымі гульнямі, здаровага ладу жыцця [3].

Такім чынам, Вышэйшы савет падзяляўся на тры аддзелы – Аддзел фізічнага выхавання (Wydział Wychowania Fizycznego), Аддзел ваеннай падрыхтоўкі (Wydział Przysposobienia Wojskowego), Аддзел спартыўных арганізацый (Wydział Organizacyj Sportowych), якія павінны былі курыраваць адпаведныя пытанні свайго накірунку [7].

Структурнымі адзінкамі на месцах былі Ваяводзкія камітэты фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі (Wojewódzkie Komitety Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego), ім падпарадкоўваліся Павятовыя камітэты камітэты фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі (Powiatowe Komitety Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego) апошнія ў сваю чаргу маглі ствараць мясцовыя Камітэты на падначаленай ім тэрыторыі мясцовасцей або гмін [7].

Праз два гады пасля стварэння разглядаемай структуры была праведзена яе рэарганізацыя, у сувязі з «Майскім пераваротам», які быў здзейснены 12 мая 1926 года. У выніку якога да ўлады прыйшлі Юзаф Пілсудскі і яго паплечнікі. Гэта прывяло да ўзмацненне аўтарытарных метадаў кіравання і кардынальных зменаў у палітычнай сістэме краіны, якія ўвайшлі ў гісторыю пад назвай «санацыі» [12].

Разам з тым, адбыліся змены і ў сферы дзяржаўнага рэгулявання фізічнай культуры і спорту. 28 студзеня 1927 года Саветам Міністраў была ўхілена папярэдняя пастанова аб стварэнні Вышэйшага савета і ўтворана новая арганізацыя – Дзяржаўнае ўпраўленне фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі (Państwowy Urząd Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego) [14].

Між іншым, у распараджэнні было адзначана, што дзейнасць, якая адносіцца да ўсеагульнага фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі палягае на Дзяржаўным упраўленні фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі (далей – Дзяржаўнае ўпраўленне) пры Міністэрстве вайсковых спраў. Кіраўніком структуры з'яўляецца Дырэктар, які прызначаецца Міністрам, пасля яго ўзгаднення з Міністрам унутраных спраў і Міністрам па справах рэлігіі і народнай адукацыі [10].

Былі вызначаны асноўныя задачы, якімі павінна займацца ўпраўленне:

1) распрацоўка прынцыпаў рэгулявання ў справах фізічнай культуры і ваеннай падрыхтоўкі;

2) прадстаўленне адпаведным міністэрствам прапаноў, якія датычацца выдання нарматыўных актаў і законапректаў у сферы фізічнай культуры і ваеннай падрыхтоўкі;

4) нагляд за дзейнасцю ўстаноў, арганізацый у сферы фізічнай культуры і ваеннай падрыхтоўкі;

5) унясенне прапаноў Міністру вайсковых спраў інфармацыі, прапаноў па дзейнасці Дзяржаўнага ўпраўлення, яго кадравых пытанняў, складу Навуковага савета па пытаннях фізічнага выхавання, Ваяводзкіх камітэтаў фізічнага выхавання і іншых вайсковых структур па пытаннях фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі;

6) прадстаўленне адпаведным міністэрствам плана бюджэту і выдаткаў у сферы фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі;

7) унясенне прапаноў, пректаў у Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства па справах рэлігіі і народнай адукацыі ў галіне фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі;

8) выданне дырэктыў для Ваяводзкіх камітэтаў фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі;

9) выданне часопісаў, літаратуры ў галіне фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі [14].

Рэгіянальнымі прадстаўніцтвамі былі Ваяводзкія і Павятовыя камітэты фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі, а па неабходнасці ў населеных пунктах маглі быць створаны мясцовыя Мейскія камітэты фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі.

Такім чынам, у адрозненні ад папярэдняга Вышэйшага савета, які падпарадкоўваўся Міністэрству па справах рэлігіі і народнай адукацыі, новая структура была створана на базе Міністэрства вайсковых спраў, што можа быць абумоўлена больш пільнай увагай да пытання фізічнага выхавання з боку ўладаў і стратэгічнага значэння пытанняў фізічнай культуры сярод насельніцтва.

Важнае значэнне таксама мела і змена статусу арганізацыі – з Савета на Дзяржаўнае ўпраўленне, а таксама стварэнне Навуковага савета фізічнага выхавання (Rada Naukowa Wychowania Fizycznego).

Як адзначалася ў Пастанове Савета міністраў ад 28 студзеня 1927 года, задачамі Навуковага савета фізічнага выхавання (далей – Навуковы савет) пры Міністэрстве вайсковых спраў з’яўляюцца навуковыя даследаванні, выданне навуковых прац і ўнясенне прапаноў па пытаннях фізічнага выхавання [10].

Адпаведна з таемным дадаткам да загада Генеральнага штаба Міністэрства вайсковых спраў ад 27 сакавіка 1927 г. склад Дзяржаўнага ўпраўлення, акрамя дырэктара і яго намесніка складаўся з Агульна-арганізацыйнага аддзела, Аддзела фізічнага выхавання і Рахунка-бюджэт-

нага рэферата і канцылярыі [14].

Але дадзены арганізацыйны падзел не быў канчатковым, на працягу амаль дзесяці год адбываліся змены ў структуры вышэйадзначанага апарата, а з 1935 года ён складаўся з наступных аддзелаў: Агульны, Фізічнага выхавання і спорта, Абарончай падрыхтоўкі, Забеспячэння, Жаночага фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі [14].

Гэта было выклікана пэўнымі пераменамі ў грамадстве, развіццём спартыўных гульняў і спробай уключэння найбольшай колькасці грамадзкага насельніцтва ў сферу фізічнай культуры, а разам з тым – ваеннай падрыхтоўкі.

У сувязі з чым, знакавай падзеяй у станаўленні дзяржаўнай сістэмы рэгулявання спартыўнай сферай было заключанае пагадненне паміж Дзяржаўным ўпраўленнем і Польскім саюзам спартыўных саюзаў (Związek Polskich Związków Sportowych), які фактычна аб’ядноўваў спартыўныя таварыствы па розных яго відах на тэрыторыі Польскай Рэспублікі [13].

Згодна з дамовай, кіруючую функцыю у разглядаемай сферы мела Дзяржаўнае ўпраўленне, як прафесійны дзяржаўны орган, а Польскі саюз спартыўных саюзаў (далей – Польскі саюз) мусіў з’яўляцца вышэйшым грамадзкім і кансультацыйным органам. Між іншым адзначалася, што ў выпадку рознагалоссяў паміж двума структурамі права вырашальнага голасу мела Дзяржаўнае ўпраўленне [6].

Асобна трэба вылучыць структуру, якая ўзнікла ў сувязі далучэннем польскіх спартсменаў да міжнародных спаборніцтваў, у першую чаргу Алімпійскіх гульняў 1920 года ў Антверпене.

У 1919 годзе на агульным сходзе прадстаўнікоў турыстычных, легкаатлетычных таварыстваў і зімовых гульняў быў створаны Камітэт ўдзелу Польшчы ў Алімпійскіх гульнях (Komitet Udziału Polski w Igrzyskach Olimpijskich), інакш – Польскі камітэт Алімпійскіх гульняў (Polski Komitet Igrzysk Olimpijskich), пратэктарат над якім узяў Кіраўнік дзяржавы Юзэф Пілсудскі [4].

Задачай Камітэта была падрыхтоўка спартсменаў для ўдзелу на Алмпіядах. Але як адзначаюць некаторыя польскія гісторыкі, напрыклад Дабеслаў Дудэк (Dobiesław Dudek), новастворанaя структура на пачатку свайго існавання да 1925 года фактычна не мела юрыдычных правоў і не значылася ў спісе спартыўных таварыстваў [8].

Адразу пасля стварэння Камітэт накіраваў афіцыйны ліст у Міжнародны Алімпійскі Камітэт на ўдзел Польскай Рэспублікі ў VII Алімпійскіх гульнях і распачаў працу па стварэнню спартыўных саюзаў, а таксама нацыянальнай зборнай і яе падрыхтоўку. Але з прычыны вайсковага канфлікту з РСФСР у 1920 годзе дзейнасць арганізацыі была прыпынена [11].

Аднаўленне дзейнасці па пытаннях удзелу польскіх спартсменаў у Алімпійскіх гульнях пачалося з 1922 года. На з’ездзе Польскага саюзу было прынята рашэнне аб аб’яднанні з Польскім камітэтам Алімпійскіх

гульняў, а ў 1925 годзе арганізацыя змяніла назву на Польскі Алімпійскі камітэт (Polski Komitet Olimpijski).

Арганізацыя займалася пытаннямі ўдзелу прадстаўнікоў Польскай Рэспублікі ў шэрагу міжнародных турніраў, у тым ліку на Першых зімовых Алімпійскіх гульнях і Гульнях VIII Алімпіяды у 1924 годзе, Гульнях IX Алімпіяды ў 1928 годзе і інш. [4].

Пасля вышэйадзначанай дамоўленасці 1935 года, Польскі Алімпійскі камітэт становіцца часткай Дзяржаўнага ўпраўлення.

Такім чынам, з моманту абвяшчэння незалежнасці Польскай Рэспублікі ў 1921 годзе адбывалася паступовае стварэнне сістэмы дзяржаўнага рэгулявання пытаннямі фізічнай культуры і спорту, як адной з галоўных сфер жыцця грамадства.

Фактычна гэты працэс адбываўся на працягу амаль усяго міжваеннага перыяду, што было абумоўлена пераменамі ў грамадскім і палітычным жыцці краіны, а таксама ўключэннем не толькі фізічнай культуры, але розных відаў спорту ў кола дзяржаўных інтарэсаў.

Умоўна, станаўленне органаў дзяржаўнага рэгулявання можна падзяліць на некалькі этапаў: 1921–1925 гг. – працэс стварэння першай структурнай адзінкі Рэферата пры Міністэрстве па справах рэлігіі і народнай адукацыі, а таксама дарадчых аддзелаў па пытаннях фізічнага выхавання пры адпаведных міністэрствах, 1925–1927 гг. – дзейнасць Вышэйшага савета пры вышэйадзначаным міністэрстве, 1927–1939 гг. – стварэнне Дзяржаўнага упраўлення і Навуковага савета пры Міністэрстве вайсковых спраў, як адзінага кіруючага дзяржаўнага органа ў галіне фізічнай культуры, спорта і ваеннай падрыхтоўкі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Крадман, Д.* Шведская система физических упражнений / Д. Крадман. – Петроград: Типография имени Евгении Соколовой, 1923. – С. 8–10.

2. Энциклопедический словарь Брокгауза и Ефрона в 82 т. (1890–1907) / под ред. И. Е. Андреевского. – СПб.: Акционерное об-во Брокгауз-Ефрон, 1904. – Т. XLIA. – С. 692.

3. *Łopuszański, T.* Zadania Rady Naczelnej Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Woiskowego / T. Łopuszański // Referaty: referaty wygłoszonie na pierwszym plenarnem posiedzeniu Rady Naczelnej Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego. – Warszawa: Drukarnia Państwowa, 1926. – S. 6–7.

4. *Łyskawa, M.* Idea olimpijska w Polsce (1918–2008) / M. Łyskawa // Zeszyty Naukowe Uniwersytetu Szczecińskiego. Prace Instytutu Kultury Fizycznej. – 2010. – № 26 – S. 9–10.

5. *Małolepszy, E.* Z dziejów organizacji i zarządzania kulturą fizyczną / E. Małolepszy // Kultura Fizyczna T. IV / red. E. Małolepszy. – Częstochowa : Akademia im. Jana Długosza w Częstochowie, 2001. – S. 23–28.

6. «Nowe wielkie szlaki sportu polskiego»: o współprace Państwowego Urzędu Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego z Związkiem Polskich Związków Sportowych // Przegląd Sportowy. – 1935. – 20 kwiet. – S. 2.

7. O utworzeniu Rady Naczelnej Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego oraz Wojewódzkich i Powiatowych Komitetów Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego : Rosporządzenie Rady Ministrów z dnia 25 kwietnia 1925 r. // Dziennik Ustaw

Rzeczypospolitej Polskiej. – 1925. – № 45 – S. 633–635.
8. *Pasko, A.* Polski Komitet Olimpijski w okresie stalinizmu / A. Pasko // Dzieje Najnowsze. – 2010. – № XLII – S. 1–2.
9. «Rosporządzenie Ministra Zdrowia Publicznego oprzedmiocie powołania Rady do Spraw Wychowania Fizycznego i Kultury Cielesnej»: opowołaniu Rady do Spraw Wychowania Fizycznego i Kultury Cielesnej // Monitor Polski. – 1920. – 19 stycz. – S. 1.
10. «Rosporządzenie Ministra Zdrowia Publicznego w sprawie utworzenia Państwowego Urzędu Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego»: o powołaniu Państwowego Urzędu Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego // Monitor Polski. – 1927. – 3 lut. – S. 1–2.
11. *Szujecki, K.* Życie sportowe w Drugiej Rzeczpospolitej / K. Szujecki. – Warszawa: Bellona SA, 2012. – S. 45.
12. *Topolski, J.* Historia Polski / J. Topolski. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskie sp. z o.o., 2015. – S. 301.
13. Wielka Ilustrowana Encyklopedja Powszechna: w 22 t. / red. W. Horzyca. – Kraków: Wydawnictwo Gutenberg, 1929. – Tom XVI. – S. 166–167.
14. *Wojtycza, J.* Państwowy Urząd Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego jako element koordynacji system bezpieczeństwa w II RP w latach 1927–1939 / J. Wojtycza // Bespeczenstwo. Teoria i praktyka / red. K. Budzowski. – Kraków: 2012. – № 2(VII) – S. 81.
15. *Wojtycza, J.* Studia i materiały z dziejów przysposobienia wojskowego w Polsce w latach 1918–1926 / J. Wojtycza. – Krakow : Wydawnictwo Naukowe Akademii Pedagogicznej, 2001. – S. 11–12.
16. *Wroczyński, R.* Powszechne dzieje wychowania fizycznego i sportu / R. Wroczyński. – Wrocław: Wydawnictwo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1979. – S. 266–274.

**(Дата падачы: 27.02.2019 г.)**

*Я. М. Ляпешкін*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*Y. Liapeshkin*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94(476):35.076«1905/1907»**

# ІНСТЫТУТ ГУБЕРНАТАРСТВА ВА ЎМОВАХ РЭВАЛЮЦЫІ 1905–1907 ГГ. (НА ПРЫКЛАДЗЕ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ)

# INSTITUTE OF GOVERNORSHIP IN THE CONDITIONS OF THE REVOLUTION OF 1905–1907 (ON THE EXAMPLE OF THE BELARUSIAN PROVINCES)

*У артыкуле прааналізаваны асноўныя заканадаўчыя акты, якія рэгламентавалі паўнамоцтвы ўладаў падчас надзвычайнага становішча. На прыкладзе беларускіх зямель адлюстравана дзейнасць інстытута губернатараў у рэвалюцыі 1905–1907 гг. Падлічана колькасць начальнікаў беларускіх губерняў, якія змяніліся за гэты перыяд.*

*Ключавыя словы: беларускія губерні; губернатары; Палажэнне 14 жніўня 1881 г.; Першая расійская рэвалюцыя; «Курлаўскі расстрэл».*

*The article analyzes the main legal acts that regulate the activity of the authorities during an emergency. The example of the Belarusian lands reflects the activities of the institute of*